УДК: 801.48

Зяноўка Я.С., асп. (Цэнтр даследаванняў культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, г. Мінск)

ТЫПЫ ІНТАНАЦЫЙНЫХ КАНСТРУКЦЫЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРНАЙ МОВЫ

Інтанацыя – сукупнасць гукавых сродкаў мовы, якія арганізуюць маўленне. Інтанацыя ўяўляе сабой сукупнасць прасадычных элементаў маўлення, такіх як мелодыка, рытм, тэмп, інтэнсіўнасць, акцэнтны строй, тэмбр і інш. Інтанацыя з'яўляецца сродкам выказвання розных сінтаксічных значэнняў і катэгорый, а таксама дае экспрэсіўную і эмацыянальную афарбоўку маўлення [].

Інтанацыйныя канструкцыі ўжываюцца ў залежнасці ад таго ці іншага камунікатыўнага тыпу выказвання. У беларускай мове выдзяляюць тры тыпы: апавядальны, клічны і пытальны. Кожны з пералічаных тыпаў таксама складаецца з падгруп [].

Апавядальны тып выказвання перадае скончанасць, завершанасць і катэгарычнасць. Ён характарызуецца паніжэннем вышыні голасу на націскным складзе і ўжываннем сыходнага тону.

Акрамя гэтага апавядальныя сказы могуць уключаць у сябе некалькі сінтагматычных націскаў і перадаваць незавершанасць (полукадэнцыю). У гэтым выпадку існуе два варыянты ўжывання тону. Першы: на націскным складзе рух павышаецца ці застаецца роўным (узыходны тон). Другі: у канцы націскнога сказа складапавышаны рух паніжаецца (узыходна-сыходны тон).

Пытальны тып выказвання падзяляецца на пытальныя сказы без пытальнага слова, пытальныя сказы з пытальным словам і пытальныя сказы са злучнікам “а” [].

Пытальныя сказы без пытальнага слова характарызуецца ўзыходна-сыходнай мелодыкай пры адсутнасці складоў за націскным. У выпадку, калі маюцца склады за націскным, пад’ём адбываецца на націскным складзе і паніжаецца на наступным. Таксама існуе іншы варыянт: павышэнне адбываецца на канчатковым слове.

Мелодыка пытальнага сказа з пытальным словам з’яўляецца сыходнай з двума цэнтрамі. Пад’ём адбываецца на націскным складзе пытальнага слова і падзеннем на апошнім націскным складзе ў сказе.

Пытальныя сказы са злучнікам “а” могуць вымаўляцца двума варыянтамі. Першы: пад’ём на націскным складзе без канчатковага падзення. Другі: пад’ём на першым галосным, націскны склад найбольш працяглы і інтэнсіўны. Таму дынамічная крывая апісваецца як узыходная.

Пабуджальныя сказы з'яўляюцца найбольш складанай структурай і не падпадаюць пад ужыванне адназначнай інтанацыйнай канструкцыі. Гэты від сказаў апісвае эмацыйны стан гаворачага, які можа перадаць свае пачуцці любым з тонаў беларускай літаратурнай мовы. Часцей за ўсё пабуджальныя сказы характарызуюцца ўзыходна-сыходнай петлепадобнай фігурай.

Неабходна адзначыць, што вышэй пералічаныя камунікатыўныя тыпы выказвання падзяляюцца на падтыпы, у якіх можа ўжывацца адразу некалькі інтанацыйных канструкцый. Таму ніжей будуць пералічаны віды тону, якія фарміруюць інтанацыйныя канструкцыі беларускай літаратурнай мовы [1, с. 61].

1. Роўны тон характарызуецца захаваннем нязменнай вышыні голасу. Выдзяляюць высокі, нізкі і сярэдні тоны.
2. Узыходны тон. У маўленні перадае няўпэўненасць, некатэгарычнасць.
3. Сыходны тон. Перадае катэгарычнасць, завершанасць. Ужываецца ў сцвярджэннях, альтэрнатыўных пытаннях, воклічах, загадах, просьбах, запрашэннях.
4. Узыходна-сыходны тон з'яўляецца складаным тонам. Ужываецца для выражэння кантрасту, пратэсту, моцнага ўражання, у агульных пытаннях.
5. Сыходна-ўзыходны тон таксама належыць да групы складаных тонаў. Ужываецца ў некаторых агульных пытаннях з высокім узроўнем зацікаўленасці і зваротку.
6. Роўна-ўзыходны і роўна-сыходны тоны.
7. Узыходна-сыходны-ўзыходны і сыходна-ўзыходна-сыходны тоны.

Два апошнія тоны з'язляюцца складанымі трохэлементнымі тонамі, якія фарміруюць больш буйную адзінку – танальны контур, які мае свае ўласцівыя змястоўныя і фармальныя характарыстыкі.

ЛІТАРАТУРА

1. Выгонная Л.Ц. Інтанацыя. Націск. Арфаэпія / Л.Ц. Выгонная. – Мн.: Навука і тэхніка, 1991. – 215 с.

2. Николаева Т.М. Фразовая интонация славянских языков / Т.М. Николаева; под науч. ред. В.Н. Топоров. — Москва: Наука, 1977. – 278 с.

3. Брызгунова, Е. А. Звуки и интонация русской речи / Е.А. Брызгунова. — Москва: Русский язык, 1977. — 281 с.